**Ала ПЕТРУШКЕВІЧ.**

# *“ТОЛЬКІ АЙЧЫНА І ЗОСЯ”*
## ВЕРШЫ ЯНА ЧАЧОТА ДА ЗОСІ МАЛЕЎСКАЙ

Адзін з вызначальных момантаў рамантычнай паэзіі — апяванне, узвышэнне Айчыны праз вобраз каханай, калі ствараецца праўдзівы культ, якому верна служыць і перад якім у пашане схіляецца рыцар-паэт. У беларускай і польскай паэзіі гэтае велічнае двуадзінства годна прагучала ў творчасці Яна Чачота:

*Каханкаю першаю нашай — айчына,*
*Ёй служым, яе мы шануем,*
*Іругое ж каханне — вядома ж, дзяўчына,*
*Якую кахаем, мілуем* [1,87].

Тут і далей творы Я. Чачота
ў перакладзе К. Цвіркі.

Гэтыя ўзнёслыя радкі з балады “Наваградскі замак” Яна Чачота мы сёння ўспрымаем як сімвал веры і вернасці. Айчына – занядбаная, паняволеная, але ў такой ступені любая сэрцу, што на чужыне паўставала перад Янам Чачотам у абліччы Зосі Малеўскай.

Даследчыца беларускага рамантызму Ірына Багдановіч адзначае наступную асаблівасць: “Рамантычны рэгіянальны культ Айчыны быў звязаны ў Міцкевіча не толькі з канкрэтнай гістарычнай сітуацыяй, у якой ён пачынаў свой творчы шлях, але і з нацыянальнай сармацка-рыцарскай традыцыяй, калі Айчына і каханая былі прадметамі рыцарскага служэння і абагаўлення. Ва ўспрыняцці Міцкевіча два ідэалы часам былі настолькі блізкімі, што паэтычны вобраз аднаго з іх адразу ж выклікаў асацыятыўную сувязь з другім, цесна зліваючыся ў адну карціну” [2, 18–19]. Працытаванае меркаванне цалкам магчыма аднесці і да Чачотавай паэзіі.

Сапраўднай музай Яна Чачота праз усё жыццё была Зося Малеўская, дачка рэктара Віленскага універсітэта, сястра паэтавага блізкага сябра Францішка. Вершаў, прысвечаных Зосі, багата. Яны вядомыя як **“Зосіны песні”**: творы філамацкага перыяду — болей за сто з напісаных у турме — і ўрэшце паэтычныя пасланні з высылкі з глыбіні Расеі, куды паэт-выгнаннік трапіў з-за актыўнага ўдзелу ў дзейнасці Таварыства філаматаў.

У большасці сваёй па жанры гэта лірычныя песні. Дарэчы, многія вершы сапраўды былі пакладзены на музыку Станіславам Манюшкам і хараша гучалі ў выкананні самой Зосі (яна мела дасканалы голас).

Вершы вылучаюцца яскравым налётам сентыменталізму. Пачуццёвасць,

захопленасць дзявочай красой, радасць ці смутныя перажыванні, пакуты — асноўнае ў "Зосiных песнях" шчаслівага філамацкага перыяду.

Да прыкладу — "Песенька на два галасы". Усё вакол асвечана прысутнасцю каханай. Усё мае сэнс толькі таму, што спрычынілася да яе, захапіла яе ўвагу. Ствараецца ўражанне, што пачуццё так і ліецца з паэтычных радкоў, легкаплынных, узнёслых. Паўторы, выклічнікі, адмоўны паралелізм набліжаюць твор да песняў народных, ствараюць надзвычай меладычны рытмічны малюнак:

*Ах, не кветпка гэтпа — казка,*
*Бо яна трымала,*
*Ах, валошка — з красак краска,*
*Бо яна сарвала* [1, 45].

Паэтава каханая мае мноства імёнаў: *яна, мілая, любая, ты, адзіная.* Часам Ян Чачот скарыстоўвае адкрыты біяграфізм: імя *Зося* гучыць для паэта найдасканалейшай песняй. "Нeяк ля гаю мы з Зосяй лічылі..." — верш, у якім іскрысты гумар, трапны досціп пераплятаюцца са шчырым замілаваннем, захапленнем дзявочай красой. У аснове верша — мілы жарт, паэтычная гульня-лічылка. Колькасць палічаных ім і ёю ружаў ніяк не супадае, хоць кветкі пералічаны неаднаразова. У яе — пятнаццаць, ён жа ўпарта паўтарае — "шаснаццаць". Як жа хораша развейвае закаханы неўдаваную злосць любай, ставячы яе ў адзін шэраг з каралевай кветак:

*Тут на мяне Зося аж зазлавала —*
*Хоча ўцячы, размаўляць перастала.*
*"Зося, чакай, не ўцякай, мая міла:*
*Гэта ж сябе, пэўна, ты не лічыла''* [1, 51].

Верш быў пакладзены на музыку і, як відаць з прыпіскі да рукапісу, прыхільна сустрэты Зосяй-ружай: *"Гэту песню вельмі часта мы з ахвотай спявалі на праходках па гаі"* [1, 321]. Можна толькі ўявіць тую ідылічную карціну — найшчаслівейшыя хвіліны ў такім абдзеленым на пяшчоту паэтавым жыцці: яны гуляюць ля гаю, а ў наваколлі разносіцца суладны малады спеў.

Як заклінанне, як клятва вернасці гучаць словы паэта, змешчаныя побач. Відавочна, напісаныя яны былі напярэдадні высылкі на далёкі Урал: "Зося для мяне найдаражэйшая, заўсёды помніце: Зося наша найдаражэйшая, заўсёды помніце, Зося для нас наймілейшая, заўсёды помніце" [1, 321].

Тое каханне не было ўзаемным. Прыгажуня Зося Малеўская не спяшалася дарыць пяшчоту закаханаму паэту. Ён разумеў і прымаў гэта. І толькі ў вершах выказваў свае пачуцці, між якіх нярэдка прысутнічаюць смутак і журба:

*Тая, для якой так многа*
*У збалелым сэрцы ласкі,*
*Мне адвагі не ўдзяліла*
*Краскі ёй паднесці міла! [1, 46].*

У працытаваным вершы “Для каго збіраю краскі?” — кранальны лірычны сюжэт. Кветкі, непатрэбныя любай, ускладзены на магілку маленькага дзіцяткі дзеля ўцехі спакутаванай маці: “То ж анёлы прыляталі / На магілку краскі ўсклалі!” [1, 46].

Глыбокае ўражанне пакідае апошняя страфа, у якой прадчуванне: адзінота не пакіне паэта і па сконе. І сціплае жаданне, прадказанне, надзея:

*А я бедны, нешчаслівы,*
*Зноў складу тут крыжык з кветак.*
*Як памру з тугі, мо гэтак*
*Чалавек які зычлівы*
*І на мой грудок з палетку*
*Прынясе, ускіне кветку.*

Ягоны “грудок” недаступны сёння, бо ён — у замежнай Ротніцы (Літва). Шмат у якіх творах асабістыя пачуцці аўтара схаваны за рознымі сюжэтамі. Гэтак, у вершы “Трэн” створаны вобраз смутнага рыцара, асуджанага на адзіноту праз нераздзеленае каханне. Сярод пышнай каралеўскай сябрыны ён нагадвае хмурную здань і вымушаны стрымліваць у сабе шквал пачуццяў:

*Нямы. Бы скала, што хавае вулканы,*
*Што ледзьве трымае ў сабе вір агняны.*
*А з кім размаўляць? Ён няпэўны, нясмелы* [1,47].

Бо толькі яна — усеўладная гаспадыня, каралева — валодае ягоным сэрцам. Такая блізкая і такая бясконца далёкая, недасяжная:

*З адной гаманіў бы ён дзень і век цэлы.*
*Ды як пераняць яе позірк імклівы,*
*Салодкі і мройны, ад болю шчаслівы?*

Ян Чачот напісаў нямала трэнаў — журботных элегій, вядомых пад агульнай назвай “Заблудны”. Літаратуразнаўцы называюць гэты цыкл своеасаблівай «“аўтабіяграфічнай паэмай”, дзе папраўдзе адбіліся шмат якія моманты з жыцця паэта» [4, 19].

“Развітанне Касцюшкі з Юляй” — стылізацыя пад вядомую ў тым часе песню пра развітанне нацыянальнага героя з каханай. Ян Чачот, адштурхоўваючыся ад папулярнага сюжэта, адлюстроўвае свае пачуцці: верш напісаны перад высылкай. Ізноў патрыёты Айчыны ператвараюцца ў выгнаннікаў. За імем Юля схавана тая самая Зося. Па форме згаданы твор — спеўны дыялог, дуэт. Закаханыя жывуць адным пачуццём, адной верай у

незгасальную сілу кахання. Тут гучаць заклінанні: “Пра маё каханне ўспамінай!”, “Пра маё каханне не забудзь”, “З Богам будзь. Любая... Кахаю... Не забудзь”; клятвы вернасці: “Я цябе няспынна буду сніць”,“Юляю адзінай буду жыць”; прадчуванне ростані навекі: “Мо я не вярнуся з даляў тых” — і ўпэўненасць у тым, што каханне можа пераадолець і прасторавыя, і часавыя межы: “Любасць пераможа нават час” [1, 52].

Кастусь Цвірка ў прадмове да кнігі Яна Чачота “Наваградскі замак” вылучае сярод іншых яшчэ адну асаблівасць паэтычных твораў аўтара — “крылатасць” [3, 13]. У прадмове таго самага аўтара да выдання ў “Беларускім кнігазборы” (дарэчы, менавіта творы Яна Чачота адкрываюць “залатую бібліятэку Беларусі”, што ёсць знакам вялікага шанавання) такая адметнасць не названа. Лічым, што дарэмна, бо для вершаў паэта характэрны не толькі рытмічная легкаплыннасць, але і шматлікія вобразы крылатых пасланцоў неба: “Да голуба”, “Голуб”, “Вандроўная пташка”, “Зязюлька”,“Прыляцелі саколікі”, “Спявай па-над Сольчай, салоўку”. Першыя два вершы ўспрымаюцца як дыстых. “Да голуба” напісаны ў вязніцы. Вядома, што Зося дасылала лісты зняволенаму песняру, каб падтрымаць яго ў нялёгкі час. Гэта было найвялікшым шчасцем — *“..ліст ад яе. / Мілай слова!”*. Тыя лісты натхнялі Я. Чачота: за дзень ён пісаў па некалькі “Зосіных песняў”.

Адзін з самых дасканалых вершаў гэтага цыкла — “Яна далёка”, напісаны на пачатку высылкі, калі прыйшло і не адпускала балючае разуменне: яна, адзіная, далёка. У паэта, каханне якога ніколі не было ўзаемным, цяпер адабрана (пэўна, назаўсёды) і магчымасць хоць зрэдку бачыць любую. Неадчэпныя думкі пра яе ператвараюцца ў праўдзівае трызненне. Палымяны, узвышаны зварот да каханай суправаджаецца пытаннем, у якім вобраз дзяўчыны атаясамліваецца з самым значным і дарагім, што дадзена чалавеку: жыццём, маладосцю, каханнем:

*Трызню табою, адзінай,*
*О маё шчасце, дзяўчына!*
*Дзе ты, жыццё маё, ранне,*
*Ты, маё ў свеце каханне?* [1, 55].

Аўтар насычае паняцце “далёка” шматлікімі складнікамі. Боль расстання — бясконцы, як ланцугі гораў, абшары зямлі, што ляглі між закаханымі:

*Ты за той дальняю смугою!*
*Не за адной ты гарою,*
*Не за аднымі барамі,*
*Не за аднымі гарамі!* [1, 55].

Пытанне, што гучыць напрыканцы твора, умяшчае ў сабе і безнадзейнасць, і жаданне пераадолець тое “далёка”: *“Ці калі ўбачу цябе я? / Ці я прайду скрозь завеі...”.*

Верш “Голуб” таксама быў напісаны ўжо ў высылцы. Голуб — птушка-пасланец, у звароце да якой і глыбокае каханне, і незагойны смутак:

*Я паслаў бы, голуб,*
*Цябе ў любы край,*
*Дзе маё каханне,*
*Дзе мой светлы май* [1, 57].

Тут выявіўся галоўны матыў “Зосіных песняў” — любоў да Краю і дзяўчыны. А найбольш выразна ён прагучаў у вершы “Толькі Айчына і Зося…”, таксама напісаным на чужыне:

*Толькі Айчына і Зося —*
*Сёння мне ўцехай адзінай.*
*Сёння мне ўцехай адзінай,*
*Жалю і смутку прычынай* [1, 55].

Глыбіня і стрыманасць пачуццяў, узвышанае гучанне адрозніваюць працытаваны твор ад тых мілых сентыментальных песняў, што былі напісаны ў філамацкі перыяд. Гэта праўдзівы раманс, дзе пераплятаюцца высакароднасць і палымянасць:

*Я панясу да магілы*
*Любасць да краю і Зосі,*
*Хоць мне любоў гэта ў сэрцы*
*Столькі няшчасцяў прыносіць* [1, 56].

Да “Зосіных песняў” належаць не толькі інтымныя вершы Яна Чачота, але і такія ўзоры патрыятычнай лірыкі, як “О ты, край мой нешчаслівы”. У ім прадвызначаны вобразы роднай нівы, нашай долі, што стануць галоўнымі ў творчасці беларускіх нашаніўцаў амаль праз стагоддзе:

*О ты, край мой нешчаслівы!*
*Цзе ж твае ўсе абаронцы?*
*Ці ўжо ўбачаць твае нівы*
*Шматчаканай волі сонца?* [1,48].

Ян Чачот быў тым высакародным рыцарам, абаронцам паняволенай Айчыны, што праз усё жыццё пранёс веру ў яе ўваскрашэнне.

## Літаратура


1. Чачот Я. Выбраныя творы. — Мінск: Бел. кнігазбор, 1996.
2. Багдановіч І. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. — Мінск: Бел. навука, 2001.
3. Цвірка К. Песня з Навааградчыны // Чачот Я. Навааградскі замак: Творы. — Мінск: Маст. літ., 1989.
4. Цвірка К. Яркая зорка беларускага адраджэння // Чачот Я. Выбраныя творы. — Мінск: Маст. літ., 1996.